СУСТРЭЧЫ

# ПАЭТЫЧНАЯ ГАСЦЁЎНЯ З МЕДЫКАМІ

Члены Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Апанасевіч, Аліна Сабуць і Людміла Шаўчэнка 20 лістапада выступілі па запрашэнні ў паэтычнай гасцёўні “Я і паэзіЯ” Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта (медыка-псіхалагічны факультэт). Пісьменнікі шчыра падзяліліся з будучымі медыкамі сваімі творчымі пошукамі і знаходкамі, кнігамі-навінкамі, а таксама музычнымі падарункамі, якія прынеслі асаблівую асалоду слухачам.

Аліна Сабуць прэзентавала свае дзве манаграфіі “Літаратурныя дыялогі…” (2022), ““Наперадісці чалавеку гуманнаму…”: беларуская мастацкая публіцыстыка XX-XXI стагоддзяў” (2023), распавяла пра мастацкую прыроду літаратурнай творчасці, місію літаратуры служыць увасабленню Чалавека Гуманнага, пашчыравала далікатнымі “пейзажамі душы” лірычнай гераіні сваіх вершаў, а таксама запрасіла студэнтаў-медыкаў да супрацоўніцтва з Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ.

Людміла Шаўчэнка прадставіла сваю новую кнігу паэзіі “Откровение” (2024), падарыла аўдыторыі захапляльна прыгожыя вершы рознай тэматыкі: патрыятычнай і філасофскай, любоўнай і пейзажнай.

Анатоля Апанасевіча ўдзячная аўдыторыя доўга не адпускала: даспадобы прыйшлося шыкоўнае музычнае выкананне песень нашага калегі, вершы медытатыўна-філасофскай чароўнай лірыкі, а таксама верш-прысвячэнне “людзям у белых халатах” – будучым медыкам, прызванне якіх таксама, як і прызванне кожнага пісьменніка, надзвычай ГУМАННАЕ.

***САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ***
***Гродзенскае абласное аддзяленне***

**На фота:** падчас паэтычнай гасцёўні “Я і паэзіЯ” з удзелам дэлегацыі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, лістапад 2024 года.












Source:
Аліна Сабуць
ЛІТАРАТУРНЫЯ ДЫЯЛОГІ
Людмила Шевченко
ОТКРОВЕНИЕ
Вечерний листопад
КРАСНЫЕ ФРАЗЫ





ГРОДНЕНСКИЙ
ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
МЕДИЦИНСКИЙ
УНИВЕРСИТЕТ